Их воспоминания — это уникальный духовный опыт беспредельных человеческих возможностей, который мы не вправе предать забвению. Сегодня самой младшей героине проекта — 65 лет, в наших силах не допустить, чтобы прервалась связь поколений. Будем помнить всегда. Мы у них в неоплатном долгу.

***І.М. Вульвач, А.С. Свірскі***
БДЭУ (Мінск)

# МЕЦЭНАЦТВА Ў БЕЛАРУСІ: ВОПЫТ СТАГОДДЗЯЎ І СУЧАСНАСЦЬ

Развіццё культуры немагчыма ўявіць без удзелу, дапамогі ўсіх інстытутаў грамадства, бо адна дзяржава не ў стане забяспечыць разнастайные патрэбы людзей у гэтай найважнейжай галіне. Неабходна сістэма падтрымкі культуры і з боку прыватных асобаў. Мастакі заўсёды ішлі наперадзе свайго часу, і на працягу развіцця чалавецтва можна ўбачыць, як ім цяжка зацвярджаць свае новыя погляды самастойна, без падтрымкі ўплывовых людзей.

Што датычыць Беларусі, дык традыцыя падтрымкі культуры, мастацтва існуе ў нашым краі даўно і звязана са з'яўленнем і распаўсюджваннем мецэнацтва. У нашу краіну яна прыйшла з Заходняй Еўропы — праз Венгрыю і Польшчу — разам з іншымі рэнесанснымі працэсамі. Распаўсюджванне заходняй каталіцкай культуры падрыхтавала глебу для пераймання самых розных гістарычных з'яў. На землях Вялікага княства Літоўскага мецэнацтва набыло спецыфічныя рысы, якія дазваляюць лічыць яго важным складальнікам нацыянальнай культуры. Мецэнацтва і з'явілася рэальнай асновай пашырэння культурных сувязяў паміж краінамі Еўропы ў XIV — XVII стагоддзях.

Двары магнатаў сталі тымі культурнымі асяроддзямі, якімі раней былі манастыры. У гэты перыяд выразна прасочваюцца ўсе формы і напрамкі мецэнацкай дзейнасці шляхты. Падтрымка культуры лічылася абавязкам, справай гонару кожнага заможнага чалавека. Шырокае распаўсюджванне мецэнацтва ва ўсіх слаях насельніцтва спрыяла станаўленню ў Вялікім княстве Літоўскім сістэмы адукацыі, стварэнню нацыянальнай культуры, шэдэўраў мастацтва і архітэктуры, развіццю філасофіі, грамадска-палітычнай, рэлігійнай думкі і кнігадрукавання.

Аднак сапраўдны росквіт магнацкага мецэнацтва пачаўся ў Вялікім княстве Літоўскім з часоў панавання апошняга Ягелона, Жыгімонта Аўгуста. Рэнесансны ідэал быў блізкі князю не толькі па палітычных меркаваннях, але і цалкам адпавядаў яго духоўным памкненням, што не магло не адбіцца і на поглядах прыдворных. Захапленне мастацтвам і калекцыяніраваннем вымусіла шляхту звярнуцца да мецэнацтва ў мастацкай сферы. Пачалося спаборніцтва паміж магнатамі. Вынікам

гэтага можна лічыць мноства культурных каштоўнасцяў, якія з'явіліся на тэрыторыі Беларусі.

Але, на жаль, на сучасным этапе дзейнасць мецэнатаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вельмі слаба развіта. Гэта адбываецца таму, што выгадней спансіраваць нейкі тэлевізійны праект, гастролі, канцэрты папулярных артыстаў, палітычную кар'еру, а не высокае мастацтва. Трэба яшчэ шырэй вывучаць і смялей пераймаць вопыт развіцця мецэнацтва ў іншых краінах, у тым ліку і на постсавецкай прасторы. Шмат цікавага ў гэтым плане ў Расійскай Федэрацыі і на Украіне.

Не трэба думаць, што мецэнатаў на тэрыторыі Беларусі ўвогуле няма. У некаторых часопісах і газетах змяшчаюцца звесткі пра дзейнасць сучасных беларускіх мецэнатаў. Так, у 1994 г. фірма “Белнацыяналсэрвіс” выдзяляе значныя сродкі на мецэнацтва. Дырэктар прадпрыемства Ігар Клюеў — чалавек, які добра ведае беларусскую культуру, сам піша вершы і музыку.

Яго дапамогу атрымалі цэнтр этнаграфіі і фальклору “Каляндар”, харэаграфічнае вучылішча і г.д. Фірма пачала будаваць царкву ў Віцебскім раёне на беразе Сасноўскага возера. Таксама гэтая фірма дапамагае трансліраваць беларускую самабытную культуру за мяжой (Напрыклад, мастацкія калектывы “Мінскі гармонік”, “Агмень” у 1994 г. выязжалі ў Германію, дзякуючы І. Клюеву).

У тым жа 1994 г. Рускі тэатр падтрымала вытворча-камерцыйнае прадпрыемства “Лаймінг” (галоўны дырэктар — Алег Белавусаў).

Але ж хочацца, каб мецэнацтва ў Беларусі адраджалася, бо сёння моладзь выхоўваецца так, каб яна была болей патрыятычнай, але без культуры, на якой асноўваецца патрыятызм, нічога не атрымаецца. Без любові да сваей Радзімы, да сваіх каранёў, традыцый, культуры свайго краю чалавек страчвае свой твар, свой сэнс жыцця, а без моладзі — няма будучыні.

Як сказаў Мікола Гусоўскі: “Кожны народ не без роду і племя, мае летапіс свой і гісторыі след на старонках”. Вельмі хацелася б, каб мастацтва Беларусі, яе культура пакінулі след на сусветных старонках. І дапамагчы гэтаму павінны мецэнаты.

***И.С. Пыл***
БГЭУ (Минск)

# ПРОМЫШЛЕННАЯ ПОЛИТИКА ЕВРОПЕЙСКОГО СОЮЗА

Создание единого валютного рынка привлекло внимание стран Европейского союза (ЕС) к промышленному сектору. С учетом усиливающейся глобализации мирового хозяйства и того, что страны ЕС являются вторым после России торговым партнером Республики Беларусь, ха-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by